

# АЛЯКСАНДР ЧАРВЯКОЎ (1892—1937):

*...А «ворагаў партыі» не выяўляў!*

Як на маю думку, як бы ні «складваліся» палітычныя павевы і кан'юнктура, як казаў класік Адам Міцкевіч, «хады палітычныя і дыпламатычныя», імя гэтага чалавека ў нашай гісторыі застанецца назаўсёды. Што ж: і «быў» ён, і «служыў»... Шчыра? Так. З верай ва ўласнай душы і сэрцы? Таксама. Ну, а тое, што «не быў прарокам», «не прадугледзеў», « не разлічыў хоць бы колькі крокаў»...

Якія мы разумныя, прабачце, заднім розумам!

... Савецкі дзяржаўны і палітычны дзеяч Аляксандр Рыгоравіч Чарвякоў нарадзіўся ў вёсцы Дукарка Ігуменскага павета ў сям'і служачых. У 1915-м скончыў Віленскі настаўніцкі інстытут. Тады ж быў мабілізаваны ў рады царскай арміі. Прымаў удзел у рэвалюцыйных гуртках і арганізацыях, у беларускім нацыянальным бежанскім руху ў Петраградзе. Быў адным з арганізатараў і кіраўнікоў Беларускай сацыял-дэмакратычнай рабочай партыі. Удзельнік Кастрычніцкай рэвалюцыі...

Чым не бліскучая, непараўнальная біяграфія і жыццёвы шлях?! Так, прынамсі, было «модным» гаварыць у савецкія часы. І, уласна кажучы, запярэчыць такому сцвярджэнню наўрад ці можна: чалавек насамрэч прайшоў «агонь», «ваду» і «медныя трубы»...

Шкада аднаго, несумненна, самага галоўнага: ён заплаціў за гэта не толькі крывёй, але і жыццём...

...Ужо ў студзені 1918-га Аляксандр Чарвякоў становіцца камісарам Беларускага нацыянальнага камісарыята. З ліпеня таго ж года — камісар дывізіі, начальнік аддзела Усерасійска-

га бюро ваенных камісараў, адначасова «знаходзіць» час і для працы ў беларускіх секцыях РКП (бальшавікоў)...

І вось тут, на маю думку, варта спыніцца, задумацца... Так, было ўсё: бежанскі рух, сацыял-дэмакратыя, Белнацкам, бюро ваенных камісараў Расіі, секцыі расійскіх бальшавікоў... Але ж каму ўсё гэта было патрэбна?! І — галоўнае! — у імя чаго?!

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА
РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

*З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў будынку бібліятэкі*